Н.А. ЛЯЙКО, канд. гіст. навук (МІК)

# РОЛЯ ВУЧЭБНА-ВЫТВОРЧЫХ КАМБІНАТАЎ У ПАДРЫХТОЎЦЫ РАБОТНІКАЎ ДЛЯ МАСАВЫХ БІБЛІЯТЭК

У школах нашай рэспублікі існуюць міжшкольныя вучэбна-вытворчыя камбінаты (ВВК), у якіх вучні авалодваюць першапачатковымі навыкамі той або іншай прафесіі. Такія камбінаты ёсць і пры некаторых ЦБС (Ліда, Масты, Слонім) для навучання бібліятэчнай справе. Вучні X–XI класаў знаёмяцца ў іх з асновамі прафесіі бібліятэкара,набываюць бібліятэчна-бібліяграфічныя веды, практычныя навыкі.

Добра арганізавана работа па падрыхтоўцы кадраў для масавых бібліятэк у цэнтральнай бібліятэцы г. Ліды, хаця вывучэнне бібліятэказнаўства тут пачалося не так даўно, у 1987/88 навучальным годзе.

Адным з важных арганізацыйных момантаў прафарыентацыйнай работы з'яўляецца складанне вучэбна-тэматычнага плана, прызначанага для навучання вучняў X–XI класаў асновам бібліятэчнай справы ў міжшкольных ВВК. Курс навучання разлічан на 448 гадзін, у тым ліку ў X класе – 272, у XI класе – 176 гадзін. З іх 1/3 – тэарэтычныя заняткі і 2/3 – практычныя. Для правядзення заняткаў у кожным класе выдзелены адзін дзень у тыдзень: 2 гадзіны – тэарэтычныя і 4 гадзіны – практычныя заняткі. Пры гэтым значнае месца адводзіцца элементам дзелавой гульні, што дае магчымасць змяніць у некаторых вучняў адносіны да бібліятэчнай справы як да нуднай, аднастайнай, без усякай рамантыкі, да таго ж яшчэ малааплачваемай.

Аб адносінах вучняў да самастойна выбранай імі прафесіі ў ВВК сведчаць анкеты, якія яны запаўняюць на першых занятках. Аналіз часткі анкет паказвае, што сюды яны прыходзяць не толькі таму, што любяць кнігі, але і таму, што „бібліятэкары працуюць у цішыні", „хацела стаць цырульнікам або бібліятэкарам; цырульніка ў ВВК не было – пайшла на спецыялізацыю бібліятэкар масавай бібліятэкі", „прафесія не цяжкая, бібліятэкар выдае кнігі, запісвае ў картачку, а потым выкрэслівае, хоць для таго, каб знайсці кнігу, трэба многа ведаць", „у памяшканні заўсёды цёпла і чыста, снег і дождж не падаюць на галаву, вятры не дзьмуць, сядзі і чытай кнігі" і г.д. Радуе тое, што такіх меншасць, 37–39 %. Большасць вучняў прыйшлі на дадзеную спецыялізацыю, таму што „любяць кнігу", „падабаецца працаваць з кнігамі і чытачамі", „бібліятэкар многа ведае і можа кваліфікавана дапамагчы чытачу выбраць патрэбную кнігу", „цікавая работа, заўсёды маеш магчымасць мець зносіны з людзьмі" і г.д.

Каб прывабіць вучняў кнігай, даць ім сапраўднае ўяўленне аб працы бібліятэкара, прымяняюцца розныя формы правядзення заняткаў: мадэліруюцца і вырашаюцца канфліктныя сітуацыі, якія могуць быць пры абслугоўванні чытачоў, праводзяцца спаборніцтвы, хто лепш і, галоўнае, правільна выканае тую ці іншую бібліятэчную аперацыю (расставіць кнігі, зробіць поўную апрацоўку кніг, дасць тэматычную або іншую даведку і г.д.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адной з умоў паспяховага засваення праграмы з'яўляецца наведванне вучнямі бібліятэкі і іх удзел у падрыхтоўцы і правядзенні масавых мерапрыемстваў у пазакласны час. Потым на практычных занятках праводзіцца падрабязны разбор такіх мерапрыемстваў. Вялікае значэнне мае таксама распаўсюджванне вучнямі літаратуры сярод чытачоў.

У ВВК не толькі набываюць веды аб асновах бібліятэказнаўства, аб асноўных функцыях бібліятэкі і асноўных задачах, якія стаяць перад ёю на сучасным этапе, але і атрымліваюць некаторыя навыкі ў выкананні асноўных функцыях бібліятэчнай работы (камплектаванне бібліятэкі, бібліяграфічнае апісанне і сістэматызацыя дакументаў, улік і захаванне кніжных фондаў), вывучаюць інтарэсы і запатрабаванні чытачоў, асновы інфармацыйнага забеспячэння спецыялістаў народнай гаспадаркі, асноўныя формы і метады масавай работы ў бібліятэцы і г.д. Пасля двухгадовага тэрміну навучання вучні здаюць экзамены і атрымліваюць пасведчанне аб прысваенні ім кваліфікацыі бібліятэкара масавай бібліятэкі.

Аналіз тэматычнага і каляндарнага планаў, анкет вучняў ВВК, гутаркі з бібліятэчнымі работнікамі даюць падставы зрабіць вывад аб вялікім значэнні міжшкольных ВВК для падрыхтоўкі работнікаў масавых бібліятэк: па-першае, яны рыхтуюць надзейных абітурыентаў для інстытутаў культуры і бібліятэчных тэхнікумаў, якія, ведаючы як станоўчыя, так і адмоўныя бакі гэтай нялёгкай прафесіі, свядома робяць свой выбар; па-другое, ВВК ствараюць рэзерв для папаўнення супрацоўнікаў сельскіх бібліятэк, якія ў далейшым атрымаюць спецыяльную адукацыю на завочным аддзяленні інстытута культуры; па-трэцяе, вучэбныя камбінаты садзейнічаюць развіццю літаратурнага густу, дапамагаюць навучыцца паглыбленаму чытанню, лагічнаму мысленню, уменню свабодна выказваць свае думкі.

Мінскаму інстытуту культуры сумесна з нацыянальнай бібліятэкай Беларусі неабходна дапамагаць міжшкольным ВВК у арганізацыі і правядзенні іх заняткаў. У сувязі з гэтым добра было б выдаць праграму і метадычныя ўказанні для падрыхтоўкі вучняў па спецыяльнасці „бібліятэкар масавай бібліятэкі", абагульніць і распаўсюдзіць сярод бібліятэк рэспублікі вопыт работы міжшкольнага ВВК г. Ліды, стварыць вучэбны дапаможнік для падрыхтоўкі бібліятэчных работнікаў для масавых бібліятэк з дапамогай міжшкольных ВВК. Выкладчыкам інстытута мэтазгодна прысутнічаць на экзаменах у міжшкольных ВВК па падрыхтоўцы работнікаў для масавых бібліятэк з мэтай папярэдняга адбору абітурыентаў.

**В.А. КАСАП, канд. пед. навук (МІК)**

## ПАЛЯПШЭННЕ ЯКАСЦІ ПАДРЫХТОЎКІ СТУДЭНТАЎ У ГАЛІНЕ ПАТЭНТНАЙ ІНФАРМАЦЫІ

Вядучую ролю ў паскарэнні навукова-тэхнічнага прагрэсу адыгрывае ўкараненне ў практыку найноўшых прыярытэтных навуковых і тэхнічных ідэй. Даследаванні сведчаць, што рэалізацыя іх забяспечвае каля 75 % пры-

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ